# Гуканне вясны

Абрад праходзіць пад канец сакавіка — пачатак красавіка, калі канчаецца халодная і доўгая зіма, а на змену ёй прыходзіць вясна, якая нясе людзям цяпло і святло. Каб развітацца з зімой і паскорыць надыход вясны, праводзіцца прыгожы і радасны абрад «Гуканне вясны»

Звычай праводзіць зіму і сустракаць вясну сыходзіць сваімі каранямі ў мінулае: гэтым займаліся яшчэ язычніцкія продкі беларусаў. Рытуалы, звязаныя з гэтым святам, яны праводзілі да тых часоў, пакуль не трэба было выходзіць на поле і рыхтаваць глебу да сяўбы. З прыходам на беларускія землі хрысціянства свята часта стала супадаць з царкоўным святам Благавешчанне.

Ключавой фігурай свята з'яўляецца бусел. Месца святкавання выбіраецца на ўзвышшы, прасторнае і светлае, усё навокал упрыгожваецца стужкамі, рознакаляровымі папяровымі птушкамі, вырабамі з каляровых нітак, тканін і прыродных матэрыялаў. Самаробных птушачак мацавалі як мага вышэй, каб тыя птушкі, якія паляцелі восенню на поўдзень, хутчэй іх заўважылі. Таксама ўпрыгожваліся хаты, садовыя дрэвы, гаспадарчыя пабудовы. Да галінак прывязвалі яркія стужкі. Гэта сімвалізавала цвіценне. Продкі верылі, што дрэвы могуць «заразіцца» яркасцю і жывасцю стужак і хутчэй раскрыюць свае пупышкі. Традыцыйна пякліся «буські» — невялікія птушкі са звычайнага цеста (мука, вада, соль). Буські раскладваліся ў акрузе, каб таксама прыцягваць увагу птушак, якія, згодна павер'ю, прынясуць вясну на сваіх крылах.

Акрамя песень і карагодаў некаторыя людзі залазілі як мага вышэй — на дахі пабудоў альбо дрэвы, каб вясна і птушкі, якія яе неслі, маглі ўбачыць іх здалёк. Народныя гулянні працягваліся некалькі дзён. Людзі весяліліся, смяяліся, гулялі ў розныя гульні: у гэтага абрада не было выразнага сцэнарыя. Самым галоўным было — паказаць вясне, што на зямлі добра. І гэта галоўная для яе прычына, каб хутчэй прыйсці. Акрамя таго, маладыя хлопцы і дзяўчаты ў гэтыя дні прызнаваліся адзін другому ў каханні. Лічылася, што вясна, як сімвал чысціні, прыгажосці і кахання, будзе дапамагаць закаханым. Хлопцы не толькі прызнаваліся ў сваіх пачуццях, але і прасілі рукі каханай.

«Гуканне вясны» — яркае і самабытнае народнае свята, якое да нашых дзён захавала сваю натуральнасць і жывасць.